зации с последующим определением на работу;

– магистр – это специалист, имеющий хорошую базовую подготовку по фундаментальным наукам и получившим дополнительную подготовку в течение 2-х лет по специальности, успешно сдавший все экзамены, предусмотренные учебным планом, выполнивший и защитивший квалификационную работу на степень магистра. Предполагается известная индивидуализация обучения магистров для выполнения узко-профессиональных задач: исследователей, разработчиков, конструкторов, преподавателей вузов и колледжей и т.п. По нашим данным общее число обучающихся на магистерском курсе не должно превышать I:5 в отношении к бакалаврам. Основанием для зачисления на магистерский курс должен быть конкурс среди бакалавров.

При переходе вузов на многоуровневую систему подготовки предполагается предусматривать в учебных планах изучение курсов по выбору в рамках установленных специальностей. Преподавание этих курсов проводить, как правило, на коммерческой основе.

Хотелось бы отметить еще и то, что перевод вузов на многоуровневую систему подготовки и изменение их названия и статуса будет проводиться после предварительной аттестации и получения соответствующего сертификата.

К сказанному следует добавить, что от оценки, полученной вузом в процессе аттестации будет зависеть и его финансирование.

Перевод на многоуровневую систему высшего образования предполагает решение такой важной задачи, как интеграция близкородственных специальностей, открытие в связи с этим ряда новых специальностей широкого профиля, а также научно-обоснованное прогнозирование потребности как для государственных предприятий и организаций, также по долговременным контрактам с частными фирмами и ассоциациями.

## ПЕРСПЕКТЫВЫ РАЗВІЦЦЯ СТАНДАРТЫЗАЦЫІ У ГАЛІНЕ БІБЛІЯТЭЧНАЙ СПРАВЫ У РЭСПУБЛІЦЫ БЕЛАРУСЬ

Р.С.Матульскі

Удасканаленне дзейнасці бібліятэчных устаноў, забяспячэння надзейнасці і аператыўнасці бібліяграфічнага, дакументальнага і

інфармацыйнага абслугоўвання карыстальнікаў бібліятэк, развіцця міжнароднага супрацоўніцтва ў галіне бібліятэчнай справы ў цяперашні час немагчыма здзейсніць без выкарыстоўвання сродкаў і метадаў стандартызацыі. Стандарты ў галіне бібліятэчнай справы і бібліяграфіі сталі аб'ектыўнай рэчаіснасцю.

Стандартызацыя любых працэсаў і з'яў здзейсняецца на некалькіх узроўнях: міжнародным, рэгіянальным, нацыянальным (які ў СССР быў дапоўнены рэспубліканскім і галіновым) на ўзроўні прадпрыемстваў і устаноў. Дасягнуць станоўчага эфекту ў дзейнасці любой установы магчыма толькі пры найбольшай ступені адпаведнасці яго стандартаў стандартам больш высокага ўзроўню.

У цяперашні момант на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь у галіне бібліятэчнай справы часова дзейнічаюць стандарты, зацверджаныя Дзяржстандартам СССР. Новыя стандарты не распрацоўваюцца і, адпаведна, не укараняюцца ў практыку работы бібліятэк. Такое становішча доўга захоўвацца не можа, так як у тэорыі і практыцы бібліятэчнай справы рэспублікі, як і ў любой іншай сферы дзейнасці адбываюцца пастаянныя змены, якія неабходна адлюстраваць у адпаведных нарматыўных дакументах.

Склаўшаяся сітуацыя ўжо цяпер адмоўна адлюстроўваецца на развіцці бібліятэчнай справы рэспублікі. Так, распрацоўка заканадаўчых і падзаконных актаў, палажэнняў, інструкцый і інш. дакументаў грунтуецца на ўжо ўстаяўшыхся паняццях і палажэннях, замацаваных у стандартах. Цяпер у распрацоўках падобных дакументаў як на ўзроўні бібліятэчнай справы рэспублікі, так і на ўзроўні асабовых бібліятэк няма неабходнай метадалагічнай базы, так як рэспубліканскіх стандартаў у нас няма, а аб міжнародных стандартах мы амаль нічога не ведаем.

У сувязі са змяніўшымся палітычным становішчам - стварэнне суверэннай дзяржавы - Рэспублікі Беларусь - шматлікія палажэнні, зафіксаваныя ў Дзяржстандартах СССР, асабліва якія датычацца ідэалагічнага аспекту дзейнасці бібліятэк, функцыянавання рэгіянальных службаў страцілі сваю значнасць і могуць разглядацца толькі ў гістарычным, а не нарматыўным аспекце.

Акрамя таго, з наданнем у краіне беларускай мове статуса дзяржаўнага ўзнікла неабходнасць перакладу шэрагу афіцыйных, даведачных, вучэбных, вытворчых і іншых матэрыялаў, а таксама

прафесійных зносін на беларускую мову. Вольныя пераклады тэрмінаў і азначэнняў, словатворчасць асобных спецыялістаў можа прывесці як да бібліятэказнаўчых, так і філалагічных памылак якія ў далейшым будзе вельмі складана выправіць.

Прыведзеныя факты сведчаць аб неабходнасці развіцця стандартызацыі ў галіне бібліятэчнай справы ў Рэспубліцы.

Магчымы тры варыянты вырашэння дадзенай праблемы:

1. Стварэнне уласнай сістэмы стандартызацыі;

2. Прымяненне ў якасці нацыянальных міжнародных стандартаў;

3. Прыняцце ў якасці нацыянальных стандартаў іншых дзяржаў.

Найбольш пераважным і прэстыжным з'яўляецца першы варыянт. Аднак у цяперашні час бібліятэчная справа рэспублікі не мае неабходных фінансавых, арганізацыйных і інтэлектуальных рэсурсаў для яго рэалізацыі. Стварэнне рэспубліканскай сістэмы стандартаў па бібліятэчнай справе неабходна разглядаць як канчатковую мэту дзейнасці ў дадзеным накірунку.

Прыняцце міжнародных стандартаў у якасці нацыянальных таксама звязана з шэрагам цяжкасцей, так як у рэспубліцы няма нават неабходнай бібліяграфічнай базы дадзеных па міжнародным стандартам, не гаворачы ўжо аб саміх стандартах. Акрамя таго, здзейсняць пераклады, тыражыраванне і распаўсюджванне міжнародных стандартаў маюць права толькі дзяржавы - удзельнікі дадзеных арганізацый. Прадстаўнікі Рэспублікі Беларусь пакуль што не з'яўляюцца членамі ні ІСА, ні ІФЛА.

Нават калі пералічаныя цяжкасці фармальнага характару былі б пераадолены, узнікаюць праблемы змястоўнага плану. Для таго, каб на тэрыторыі той або іншай дзяржавы былі ўкаранены і эфектыўна дзейнічалі міжнародныя стандарты неабходны адпаведны ўзровень развіцця.

Як ужо неаднаразова зазначалі спецыялісты, бібліятэчная справа рэспублікі знаходзіцца цяпер у глыбокім крызісе. Акрамя таго, яна амаль не інтэгравана ў міжнароднае бібліятэчнае таварыства, што робіць практычна немагчымым ўкараненне ў Беларусі большасці міжнародных стандартаў. Так званым метадам "тытульнага ліста", або без папярэдняй перапрацоўкі ў адпаведнасці з нацыянальнымі асаблівасцямі і ўзроўнем развіцця бібліятэчнай справы рэспублікі.

Укараненне ў Беларусі ў перспектыве стандартаў іншых дзяржаў найбольш магчыма, аднак звязана з шэрагам адмоўных вынікаў. Неабходна прызнаць, што ў якасці такой дзяржавы па шэрагу прычын можа выступіць толькі Расія. Аднак далека не ўсе стандарты, распрацаваныя ў Расійскай Федэрацыі могуць быць дапушчаны для Беларусі. Распрацоўку стандартаў у Маскве прыйдзецца таксама аплачваць (хаця і ў меньшай ступені, чым членства ў ІСА). Акрамя таго рэспубліка будзе атрымліваць міжнародныя распрацоўкі праз пасрэдніка, або магчыма ва ўсечаным выглядзе, са скажэннямі і спазненнем.

На нашу думку, у цяперашні час найбольш дапушчальны кампраміоны варыянт. Неабходна прызнаць, што пры любым, нават самым малазатратным варыянце, у рэспубліцы неабходна арганізацыя, якая займалася б зацвярджэннем стандартаў, прызнаных неабходнымі для ўкаранення ў бібліятэчнай справе рэспублікі. Дадзенае пытанне можна вырашыць стварыўшы ў структуры Дзяржаўнага камітэту па стандартызацыі, метралогіі і сертыфікацыі пры Савеце Міністраў Рэспублікі Беларусь. (Дзяржкамстат РБ) тэхнічны камітэт або камісію па пытаннях стандартызацыі ў галіне навукова-тэхнічнай інфармацыі, бібліятэчнай і выдавецкай справы.

Так як, у адпаведнасці з Уставам ІСА ў яе члены ад кожнай дзяржавы можа быць прынята толькі адна нацыянальная арганізацыя па стандартызацыі, то наступным крокам у адзіным накірунку можа быць уступленне Дзяржстандарту РБ у ІСА.

Непасрэдна распрацоўку стандартаў у Рэспубліцы ў галіне бібліятэчнай справы павінна ўзначаліць прафесійныя арганізацыя. У якасці такой арганізацыі магла б выступіць нацыянальная бібліятэка Беларусі або галіновая навукова-даследчая лабараторыя (калі такая будзе створана). Ролю каардынатара ў дадзеным выпадку павінны ўзяць на сябе Беларуская бібліятэчная асацыяцыя, з'яднаўшы інтэлектуальны патэнцыял у сучасны момант у структуры асацыяцыі мэтазгодна стварыць сектар або групу па вывучэнню дадзенага пытання і распрацоўка канцэпцыі развіцця стандартызацыі ў галіне бібліятэчнай справы ў рэспубліцы.